Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by



# Беларусь партызанская

**Да Дня Перамогі і 70-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў аддзел рэдкіх кніг і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа НАН Беларусі падрыхтаваў выстаўку выданняў ваенных часоў, адкрыццё якой запланавана на 7 мая ў інфармацыйна-выставачным цэнтры.**

Будуць прадстаўлены падпольны партызанскі друк (газеты, плакаты, лістоўкі), матэрыялы з рукапісных архіваў, кнігі з серыі «Бібліятэка маладога партызана» і «Героі Айчынай вайны», кнігі з асабістай бібліятэкі кіраўніка падпольных абкамаў і райкамаў ЦК КП(б)Беларусі П.К.Панамарэнкі, творы ваенных часоў беларускіх пісьменнікаў і паэтаў, альманах «Беларусь». На многіх выданнях – аўтографы і ўладальніцкія запісы.

На выстаўцы будуць шырока дэманстравацца газеты ваенных часоў. На сучасным этапе бібліятэка захоўвае каля 600 нумароў (100 назваў) газет, якія выходзілі ў цяжкія гады вайны. Калекцыя падпольнага перыядычнага друку пачала фарміравацца з 60-х гадоў мінулага стагоддзя.

На стэлажах размесцяцца газеты-аднаднеўкі, газеты-лістоўкі. а таксама цэнтральныя, абласныя, раённыя падпольныя газеты, партызанскія, газета-агітплакат «Раздавім фашысцкую гадзіну». Усе яны займаюць пачэснае месца ў кнігасховішчы аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў.

Шмат падпольных партызанскіх газет будзе прадстаўлена на выстаўцы, сярод – «Народны мсцівец». Яе рэдактар Н.Е.Дастанка ў сваіх успамінах пісаў, як выходзіла газета. У снежні 1942 года ў Загаллі (Любанскага раёна Мінскай вобласці) знаходзілася слуцкая падпольная друкарня. Пачалі друкавацца лістоўкі. Спачатку шрыфт партызаны даставілі з нямецкай друкарні ў м. Любань, касу і станок для друкавання зрабілі




самі. У сакавіку 1943 года сакратар Слуцкага падпольнага райкама КП(б)Б І.С.Кахановіч прывёз з Масквы для падпольнай друкарні партатыўную машынку. Падчас налёту фашысцкай авіяцыі трэба было хутка зрывацца з месца і хавацца ў балотах, каб захаваць друкарскае абсталяванне. Па пояс у балотнай вадзе партызаны прабіраліся з вострава на востраў. «У адным месцы фашысты нас моцна «зажучылі», як гаварылі мы пасля жартуючы. Становішча ствaралася пагражаючае. З плячэй знялі сухары, але не пакінулі шрыфт. Сем дзён у балоце не было ў нас крошкі хлеба, але за плячыма быў шрыфт…» – успамінае Н.Е.Дастанка.

На выстаўцы можна будзе ўбачыць экзэмпляр газеты «Партызанская праўда», у якой надрукаваны верш «Гитлеровская коробушка». Ён высмейваў гітлераўцаў, іх ваенную стратэгію і паказваў народу поўны правал усёй гітлераўскай ваеннай авантуры.

Адной з самых распаўсюджаных форм падпольнага друку ў тыле ворага з'яўляліся насценныя газеты і баявыя лісткі, якія выпускаліся ва ўсіх брыгадах, атрадах, у вялікіх і малых баявых партызанскіх злучэннях. На жаль, многае з гэтага загінула беззваротна ў баях і паходах. Баявыя лісткі былі меншымі па памеры, але адказвалі на тыя ж пытанні, што і насценныя газеты. У іх шмат пісалася пра ўнутраны распарадак партызанскага жыцця, асвятляліся бытавыя пытанні. На выстаўцы невялічкая колькасць партызанскіх лісткоў будзе прадстаўлена з рукапіснага архіва І.С.Краўчанкі.

Падрабязную інфармацыю пра падпольныя партызанскія газеты, часопісы, плакаты, лістоўкі перыяду Вялікай Айчыннай вайны 1941-1945 гадоў змяшчае факсімільнае выданне «І паўстаў народ...» выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя» імя Пятруся Броўкі, якое выйшла ў свет у 2005 годзе і было прымеркавана да 60-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. «І паўстаў народ» – унікальнае выданне дакументальных матэрыялаў часоў Вялікай Айчыннай . У каталогу прадстаўлены шматлікія падпольныя і партызанскія выданні: ад рэспубліканскіх, абласных, раённых газет – да насценных лісткоў і маладзёжных антыфашысцкіх бюлетэняў. Амаль усе яны, «байцы друкаванага слова», ацалелі ў тых вогненных, гераічных днях у адзінкавых экзэмплярах і сёння захоўваюцца ў фондах аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Я.Коласа НАН Беларусі.

Выстаўка выданняў гадоў Вялікай Айчыннай вайны «Беларусь партызанская» будзе дэманстравацца ў рамках літаратурна-музычнай вечарыны «Шляхамі вайны…».

**Алена ДЗЕНІСЕНКА,**
**навуковы супрацоўнік,**
**Вольга ГУБАНАВА,**
**малодшы навуковы супрацоўнік**
**Валерыя НАВУМЕНКА,**
**навуковы супрацоўнік**
**аддзел рэдкіх кніг і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Я.Коласа НАН Беларусі**

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by